**І. Р. КАЗАЧЭНКА,**
настаўнік-метадыст Лельчыцкай раённай гімназіі

# КУБІК БЛУМА НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ Ў VIII КЛАСЕ

«Кубік Блума» — адзін з папулярных прыёмаў тэхналогіі крытычнага мыслення, распрацаваны амерыканскім вучоным і псіхолагам Бенджамінам Блумам.

Спатрэбіцца звычайны папяровы куб, на гранях якога напісаны словы: назаві, чаму, растлумач, прапануй, прыдумай, падзяліся. «Кубік Блума» дазваляе фармуляваць разнастайныя пытанні рознага характару.

Педагог ці адзін з вучняў кідае кубік. Грань, якая выпадзе, пакажа, якога тыпу пытанне трэба задаць. Зручна арыентавацца па слову на грані кубіка — з яго і павінна пачынацца пытанне.

Выкарыстоўваць гэты прыём можна на любой ступені навучання.

Першы варыянт — пытанні фармулюе настаўнік.

Другі варыянт — пытанні фармулююць самі вучні. Гэты варыянт патрабуе ад іх адпаведнай падрыхтоўкі, пэўнага досведу.

«Кубік Блума» можна задзейнічаць на ўсіх этапах урока любога тыпу. Аднак найбольш мэтазгодна выкарыстоўваць яго на падагульняльных занятках, калі ў вучняў ужо ёсць уяўленне пра сутнасць тэмы.

Пасля фармулёўкі тэмы ўрока вызначаецца кола пытанняў, на якія вучням патрэбна адказаць.

«Чаму». Гэта пытанне стымулюе вучня да актыўнага разважання. Неабходна выявіць узаемасувязь паміж часткамі інфармацыі, пры неабходнасці патлумачыць некаторыя працэсы і з’явы.

«Растлумач». Заданне па сваёй сутнасці блізкае да пытання «Чаму». Толькі ў гэтым выпадку вучні дакладна не змогуць знайсці адказ на пытанне, ім патрэбна паразважаць самастойна, абапіраючыся на свае веды.

«Прыдумай». Пры выкананні заданняў актывізуецца творчае мысленне, пазнавальная дзейнасць вучняў.

«Падзяліся». Гэта заданне — своеасаблівая зваротная сувязь. Вучні, абапіраючыся на атрыманую інфармацыю, аналізуюць асацыяцыі: падзяліся агульнымі ўражаннямі... якія сэнсавыя асацыяцыі выклікае... (лексема, прыказка, фразеалагізм, корань слова і г. д.).

«Назаві». Гэты тып заданняў накіраваны на ўзнаўленне інфармацыі.

«Прапануй». Пытанні такога тыпу скіраваны галоўным чынам на пошук альтэрнатыўных рашэнняў.




**Прыклады пытанняў**

| Назаві | Чаму | Растлумач | Прапануй | Прыдумай | Падзяліся |
|---|---|---|---|---|---|
| Прыметы словазлучэння | Гэта сінтаксічная канструкцыя называецца словазлучэннем? | Віды падпарадкавальнай сувязі слоў у словазлучэнні | Прыклады назваў літаратурных твораў як розных відаў словазлучэнняў | Уласныя прыклады словазлучэнняў, звязаных спосабам кіравання | Ці дастаткова ў маўленні карыстацца толькі словазлучэннямі? |

| Назаві | Чаму | Растлумач | Прапануй | Прыдумай | Падзяліся |
|---|---|---|---|---|---|
| Прыметы простага сказа | Неабходна ўмець знаходзіць граматычную аснову сказаў? | Сэнс лагічнага націску ў сказе | Прыклад сказа з інверсіяй | Розныя па мэце выказвання сказы | Ці дастаткова ў маўленні карыстацца толькі простымі сказамі? |

| Назаві | Чаму | Растлумач | Прапануй | Прыдумай | Падзяліся |
|---|---|---|---|---|---|
| Прыметы двухсастаўнага развітага сказа | Важна правільна вызначаць граматычную аснову ў сказе? | Сінтаксічную ролю прыметніка ў пазіцыі пасля дзейніка | Прыклад неразвітага двухсастаўнага сказа | Розныя па наяўнасці даданых членаў простыя сказы | Ці дастаткова ў маўленні карыстацца толькі неразвітымі сказамі? |

| Назаві | Чаму | Растлумач | Прапануй | Прыдумай | Падзяліся |
|---|---|---|---|---|---|
| Прыметы дзейніка як галоўнага члена сказа | Неабходна ўмець знаходзіць галоўныя члены ў сказе? | Спосабы выражэння дзейніка ў сказе | Прыклад сказаў з дзейнікамі, выражанымі прыметнікам (дзееприметнікам, прыслоўем...) | Сказы з дзейнікам, выражаным інфінітывам | Ці можа дзейнік быць выражаным словазлучэннем? |

| Назаві | Чаму | Растлумач | Прапануй | Прыдумай | Падзяліся |
|---|---|---|---|---|---|
| Прыметы выказніка як галоўнага члена сказа | Не толькі дзеяслоў можа быць выказнікам? | Спосабы выражэння дзеяслоўнага выказніка | Прыклады сказаў з састаўным іменным выказнікам | Уласныя прыклады сказаў з рознымі відамі састаўнога выказніка | Чым выражаецца лексічнае і граматычнае значэнне выказніка? |

| Назаві | Чаму | Растлумач | Прапануй | Прыдумай | Падзяліся |
|---|---|---|---|---|---|
| Прыметы аднародных членаў сказа | Аднародныя члены сказа не ўтвараюць паміж сабой словазлучэнні? | Спосабы пастаноўкі знакаў прыпынку пры аднародных членах сказа | Прыклады сказаў з неразвітымі аднароднымі членамі | Уласныя прыклады сказаў з рознымі радамі аднародных членаў | Чым могуць быць выражаны абагульняльныя словы пры аднародных членах сказа? |

| Назаві | Чаму | Растлумач | Прапануй | Прыдумай | Падзяліся |
|---|---|---|---|---|---|
| Сінтаксічныя канструкцыі, якімі могуць быць ускладнены простыя сказы | Неабходна ўмець знаходзіць звароткі, пабочныя словы, устаўныя канструкцыі ў сказе? | Спосабы пастаноўкі знакаў прыпынку пры ўстаўных канструкцыях | Прыклады сказаў з пабочнымі словамі і такімі ж словамі — членамі сказа | Як, выкарыстоўваючы пабочныя словы большай ступені ўпэўненасці, пераканаць сябра ў неабходнасці займацца музыкай | Уласнымі назіраннямі за недарэчным ужываннем слоў у беларускай мове |

| Назаві | Чаму | Растлумач | Прапануй | Прыдумай | Падзяліся |
|---|---|---|---|---|---|
| Сінтаксічную ролю адасобленых членаў сказа | Азначэнні, выражаныя дзеепрыметнікавым зваротам, не заўсёды адасабляюцца? | Спосабы пастаноўкі знакаў прыпынку пры адасобленых прыдатках | Прыклады сказаў з адасобленымі дапаўненнямі | Уласныя прыклады сказаў з адасобленымі акалічнасцямі са значэннем уступкі | Ці заўсёды можна замяніць у сказе адзін з дзеясловаўвыказнікаў дзеепрыслоўем? |

| Назаві | Чаму | Растлумач | Прапануй | Прыдумай | Падзяліся |
|---|---|---|---|---|---|
| Злучнікі, якія могуць выкарыстоўвацца пры параўнальных зваротах | Параўнальныя звароты шырока выкарыстоўваюцца ў мастацкай літаратуры? | Спосабы пастаноўкі знакаў прыпынку пры параўнальных зваротах | Прыклады сказаў, дзе параўнальныя звароты не выдзяляюцца коскамі | Уласныя прыклады сказаў з фразеалагізмамі ў ролі параўнальных зваротаў | Ведамі пра сінтаксічную ролю параўнальных зваротаў |

## Спіс літаратуры

*Бадзевіч, З. І.* Беларуская мова : вучэб. *дапам.* для 8-га кл. устаноў агул. сярэд. *адукацыі* з белар. і рус. мовамі навучання / З. І. Бадзевіч, І. М. Саматыя. — Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2020. — 255 с.

*Каральчук, М.* Кубік Блума, «разумныя сшыткі», буксэлфі… / М. Каральчук // Брестский областной институт развития образования. Центр повышения квалификации педагогических кадров [Электронный ресурс]. — Рэжым доступу: *https://boiro.by>document-169603*. — Дата доступу: 12.05.2021.

*Шаматранова, Л. К.* Кубик Блума / Л. К. Шаматранова // Рус. яз. и лит. — 2020. — № 5. — С. 24—25.